УДК 821.161.3

**Я. В. Шчэрба, Т. М. Пучынская**
Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Баранавічы імя С. І. Грыцаўца», Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, вул. Ф. Скарыны, 11, 225406 Баранавічы, Рэспубліка Беларусь,
+375 (163) 68 05 86 yana.shcherba@list.ru
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, вул. Войкава, 21, 225404 Баранавічы, Рэспубліка Беларусь,
+375 (163) 68 01 59, philology@lenta.ru

# ВОБРАЗ КАМАНДЗІРА Ў «ЛЕЙТЭНАНЦКАЙ ПРОЗЕ» ВАСІЛЯ БЫКАВА І БАРЫСА ВАСІЛЬЕВА

У артыкуле на прыкладзе творчасці В. Быкава і Б. Васільева раскрываецца змест паняцця «лейтэнанцкая проза», у кантэксце эпохі выяўляецца ўзаемадзеянне беларускай і рускай літаратур, паказваецца тыпалагічнае падабенства прозы, створанай пісьменнікамі-франтавікамі паводле ўласнага ваеннага вопыту. Асаблівая ўвага надаецца інтэрпрэтацыі вобраза камандзіра як галоўнага героя «франтавых» твораў, асэнсаванню тыповых рыс характараў персанажаў.
**Ключавыя словы:** «лейтэнанцкая проза», В. Быкаў, Б. Васільеў, гераічнае, трагічнае, вайна, камандзір.
Бібліягр.: 8 назваў.

**Y. Shcherba, T. Puchinskaya**
State Educational Institution ‘Secondary School No. 1 of Baranovichi named after S. I. Gritsevets’, Ministry of Education of the Republic of Belarus, 11 F. Skarina str., Baranovichi, Republic of Belarus, 225406
+375 (163) 68 05 86 yana.shcherba@list.ru
Educational institution ‘Baranovichi State University’, Ministry of Education of the Republic of Belarus, 21 Voykov str., Baranovichi, Republic of Belarus, 225404
+375 (163) 68 01 59 philology@lenta.ru

# THE IMAGE OF THE COMMANDER IN ‘LIEUTENANT'S PROSE’ BY VASIL BYKOV AND BORIS VASILIEV

The article uses the example of V. Bykov’s and B. Vasiliev’s works to reveal the content of the concept ‘lieutenant's prose’, the interaction of Belarusian and Russian literatures is manifested in the context of the epoch, the typological similarity of the prose is created by writers-front-line-soldiers from their own military experience. Special attention is paid to the interpretation of the image of the commander as the main character of the ‘front-line’ works, to the understanding of the typical characters’ traits.
Key words: ‘lieutenant's prose’, V. Bykov, B. Vasilyev, heroic, tragic, war, commander.
Ref.: 8 titles.

***Уводзіны.***

Проза пісьменнікаў франтавога пакалення дае ўяўленне пра суровую, трагічную рэчаіснасць часоў Вялікай Айчыннай вайны. Нягледзячы на значную колькасць навуковых прац, прысвечаных традыцыям «лейтэнанцкай прозы», мэтазгодна абагуліць і дапоўніць некаторыя аспекты параўнальнага вывучэння творчасці В. Быкава і Б. Васільева, усебакова інтэрпрэтаваць вобраз цэнтральнага персанажа «лейтэнанцкай прозы» — камандзіра, малодшага афіцэра, удзельніка вайны.

Актуальнасць праблемы даследавання абумоўлена неабходнасцю:

1) прыцягнення ўвагі да аналізу традыцый ваеннай прозы ў беларускай і рускай літаратурах; 2) далейшага даследавання паняцця «лейтэнанцкая проза» на прыкладзе прозы В. Быкава і Б. Васільева; 3) параўнальнага аналізу вобразаў камандзіраў — галоўных герояў «франтавых» твораў В. Быкава і Б. Васільева.

***Матэрыялы і метады даследавання.***

Матэрыялам даследавання сталі празаічныя творы В. Быкава (аповесці «Жураўліны крык», «Трэцяя ракета», апавяданні «Загад», «Жалезны камандзір»), Б. Васільева (аповесць «А зори здесь тихие», раман «В списках не значился»).

Выкарыстаны біяграфічны, апісальны, параўнальна-супастаўляльны метады.

***Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.***

На творчасць В. Быкава асабліва паўплываў яго ваенны і франтавы вопыт. Пісьменнік пачаў вайну ў званні малодшага лейтэнанта. З дзеючай арміяй прайшоў Румынію, Венгрыю, Югаславію, Аўстрыю. Асабісты вопыт франтавіка дазволіў В. Быкаву праўдзіва, рэалістычна адлюстраваць вайну («Жураўліны крык», «Трэцяя ракета», «Мёртвым не баліць», «Праклятая вышыня»; «Жалезны камандзір», «Загад» і інш.).

Б. Васільеў, як і В. Быкаў, удзельнік вайны з яе першых дзён. Ён добраахвотна пайшоў на фронт, пазней служыў у гвардзейскай паветрана-дэсантнай дывізіі, быў паранены і дэмабілізаваны з дзеючай арміі. Зварот аўтараў да свайго франтавога вопыту, паказ трагедыі чалавека на вайне, праўдзівасць у апісанні ваенных падзей характарызуе творы, які належаць да «лейтэнанцкай прозы». Яе галоўнымі героямі часта (хоць і не заўсёды) з'яўляюцца малодшыя афіцэры.

У творах В. Быкава паўстае мужны камандзір — старшына, лейтэнант, капітан, які заўсёды першы рашуча ідзе ў бой, здзяйсняе цяжкі маральны выбар, праходзіць праз трагічныя выпрабаванні і гераічна заканчвае сваё жыццё.

Галоўным героем аповесці «Жураўліны крык» з'яўляецца старшына ўзвода Рыгор Карпенка. Даваеннае жыццё героя дае магчымасць убачыць вытокі яго гераізму на вайне, калі ў экстрэмальнай сітуацыі найбольш выразна праяўляецца сутнасць чалавечага характару. Карпенка нарадзіўся ў сялянскай сям'і, быў малодшым сынам. Пасля дзесяцігадовай службы ў войску ён трапіў на фінскую вайну, дзе атрымаў медаль. Пасля звальнення ў запас Карпенку прызначылі намеснікам дырэктара льнозавода. У аповесці В. Быкава старшына паўстае як адказны службіст, строгі ў адносінах да падначаленых. Гаворку з салдатамі ён вядзе грубым голасам, але, бывае, гаворыць насцярожана і ваўкавата: «Ну, каму тут? Вам, Фішар? Хаця ж у вас лапаткі няма. Во мне яшчэ ваякі! — злосна бурчаў старшына, устаючы з калена. Колькі дзён на фронце, а лапаткі яшчэ не прыдбаў. Што, мо чакаеце, калі старшына дасць? Ці мо немец у падарунак прышле?» [1, с. 317].

Карпенка здаваўся падначаленым чалавекам, заўсёды ўпэўненым у сваіх дзеяннях. Камандзір пільна сачыў за боем, «не даваў спуску» баязліўцам. Салдаты крыху крыўдзіліся на яго за празмерную строгасць, але ў баях цанілі «крыклівага» старшыну. Непахіснасць характарызуе Карпенку як тыповага камандзіра: «Гэты гатовы разбіцца ўшчэпкі, каб толькі выканаць які бязглузды загад» [1, с. 361], — злосна думае пра яго ў сваёй палахлівай разгубленасці Аўсееў. Аднак аўтар падкрэслівае, што Карпенка «… навучыўся выяваць не толькі рашуча, мужна, але і разумна» [1, с. 361]. В. Быкаў раскрывае вобраз героя шматгранна, у характары Карпенкі паказвае і такія рысы, як эмацыйнасць, часам нават няўпэўненасць: «...Карпенка на самай справе быў не такі. Але за працяглы час камандзірства засвоіў сабе правіла: усё няпэўнае хаваць у сабе, а напаказ выстаўляць толькі скамянелую ўпэўненасць і непахісную цвёрдасць волі» [1, с. 333–334].

Для В. Быкава гераізм камандзіра — гэта не толькі рашучасць у баі, але і непаказная мужнасць, цвёрдасць духу, чалавечнасць, сумленнасць, адказнасць, самахвярнасць: «Старшына, відаць, вельмі пакутаваў... Нічога ў ім ужо не было ад былой рупнай камандзірскай строгасці, толькі цьмяна ўгадвалася ў рысах твару нейкае запытанне, здзіўленне — можа, адбілася гэта ўчарашняя развага аб тым, каму з іх, шасцярых, суджана будзе закончыць бой» [1, с. 391].

Герой аповесці В. Быкава «Трэцяя ракета» — камандзір «саракапяткі», старшына Маркел Іванавіч Жаўтых — паспяхова ваюе з пачатку вайны, сорак першага года, пра што сведчаць ордэн Айчыннай вайны і медалі. Старшына не надта пісьменны чалавек: «… Ён і камандуе разлікам, аднак, здаецца, мае самую нізкую ад усіх нас адукацыю — два ці тры класы» [2, с. 24–25]. Як і Карпенка з «Жураўлінага крыку», Жаўтых выконвае свае камандзірскія абавязкі з добрым веданнем справы, застаючыся пры гэтым памяркоўным і разважлівым чалавекам. Часам у адносінах да падначаленых ён падобны да бацькі ў вялікай сям'і: «На вайне, у франтавых абставінах ён трымаецца гэтак жа дзелавіта і

спакойна, як і ў звычайным жыцці» [2, с. 21]. Ён, як і камандзір Карпенка, увесь час думае пра сваю сям'ю і марыць пра тое, каб вайна хутчэй скончылася. В. Быкаў адзначаў, што прататытам старшыны Жаўтых быў Лук'янчанка, камандзір разліку, з якім ён ваяваў у Венгрыі: «Самы «спісаны» вобраз там — камандзір гарматы сяржант Жаўтых. Многія рысы яго знешнасці і характару я сапраўды спісаў з камандзіра майго разліку, з якім ваяваў у Венгрыі, знаходзячыся ў 10-й знішчальна-супрацьтанкавай артылерыйскай брыгадзе. Яго сапраўднае прозвішча Лук'янчанка. Значыць, ён не камандзір «саракапяткі» і не загінуў на плацдарме ў Румыніі, ён пасяхова даваяваў вайну і ў сорак пятым дэмабілізаваўся з арміі. Але ў астатнім ён той жа: па-гаспадарску разважлівы, павольны, не надта пісьменны — сапраўдны хлебароб і калгаснік, які змяніў з-за акалічнасцей вайны плуг на зброю» [3, с. 69].

У апавяданні В. Быкава «Загад» у вобразе камандзіра паўстае начальнік сувязі капітан Полазаў. У яго падначаленні знаходзіцца пяцёра салдат: тэлефаністы Пятрашкін і Айбекаў, сяржант Сімакоў, яфрэйтар Бутэнка і малодшы лейтэнант Полазаў, які нечакана прыбыў на службу. У фінале апавядання высвятляецца, што капітан Полазаў і малодшы лейтэнант Полазаў — даўнія знаёмыя, магчыма, (мяркуючы па агульнасці прозвішчаў), сваякі.

Цэнтральнае месца ў сістэме вобразаў герояў апавядання «Загад» займае капітан Полазаў. Гэта мужчына сталага веку, які ўжо зведаў жыццёвыя выпрабаванні: «Яго дужа худы, немалады ўжо, вельмі строгі і заклапочаны твар сцяўся ў прадчуванні нейкай суровай непазбежнасці» [4]. Для сваіх салдат ён здаваўся незразумелым чалавекам: «Скамянелы капітан з высунутым наперад касцістым падбародкам, жылістай шыяй і імклівым разлётам валасатых броваў здаваўся чужым, інакшым, загадкавым чалавекам» [4]. Капітан Полазаў ставіўся да падначаленых уважліва, каманды даваў спакойным тонам і глыбока перажываў, калі салдаты гінулі: «Ён, відаць, шкадаваў гэтага радыста і хоць якой-небудзь парадай хацеў засцерагчы сяржанта ад той небяспекі, што на ўзгорку чакала яго» [4].

Спачуванне сваім падначаленым, перажыванне за іх лёс спалучаюцца ў характары Полазава з патрабавальнасцю. Пасля таго, як загінулі салдаты, капітан Полазаў «глуха і прыдушана, але па-ранейшаму няўмольна і сурова» аддае загад: «…Малодшы лейтэнант Полазаў! Даць сувязь!» [4]. У душы камандзіра запанавала пустэча: «Застаўшыся адзін у траншэі, капітан неяк размяк тварам, страціў сваю суровую зацятасць — няўтоеныя роспач і боль скрывілі яго пакутныя рысы» [4]. Капітан Полазаў і малодшы лейтэнант Полазаў — героі рознага ўзросту. Капітан мае пэўны жыццёвы і армейскі вопыт, малодшы лейтэнант — толькі што трапіў на фронт. Кожнаму з іх па-свойму складана: капітан Полазаў павінен выканаць баявое заданне, несці маральную адказнасць за жыццё падначаленых салдат, малодшы лейтэнант перажывае драматычныя моманты першага ў сваім жыцці (і, можа, апошняга) бою. В. Быкаў паказвае гераізм людзей, якія пайшлі на «страшэнную справу» не толькі па камандзе, але, галоўнае, па ўнутраным перакананні [5].

У апавяданні В. Быкава «Жалезны камандзір» паказаны вобраз яшчэ аднаго сапраўднага героя — камандзіра Клімава. У адрозненне ад капітана Полазава гэта зусім малады чалавек: «…Клімаў засяродзіўся ўсім сваім вельмі брывастым, вельмі абсіверанымі ўсё ж, не зважаючы на гэта, маладым тварам» [6]. Ён, як і Полазаў, клапоціцца пра салдат і робіць усё магчымае для перамогі. Нягледзячы на свой малады ўзрост, Клімаў паспеў паваяваць, стаў камандзірам батальёна: «Ды і сам ён у гэтай роце з'явіўся нядаўна, з тыдзень назад, да гэтага быў у іншым батальёне камандзірам узвода» [6].

Акрамя Клімава, у апавяданні В. Быкава раскрываецца вобраз яшчэ аднаго камандзіра. Гэта маёр, які ўвесь час кідае сваім падначаленым «гнеўныя, злыя, несправядлівыя словы»: — Малакасосы! Спалохаліся дзясятка вшывых фрыцаў! Аўтаматчыкі мне называецца!.. [6]. Назва апавядання — «Жалезны камандзір» — выклікае асацыяцыі з вобразам маёра. У кантэксце зместу твора відавочна, што сапраўдную непахіснасць у баі праявіў менавіта малады, нявопытны лейтэнант Клімаў [6].

В. Быкаў падкрэслівае, што герой праяўляе на вайне не толькі мужнасць, але і чалавечнасць. Клімаў, ведаючы, што ён разам з салдатамі не зможа ўзяць «вышыню», адчувае страчанасць, безвыходнасць. Лейтэнант, аднак, робіць свой выбар і вядзе салдат у апошні бой. «Суровая цвёрдасць» (маёр) і ўяўная «мяккацеласць» (лейтэнант) — рысы, якія выяўляюць супрацьлегласць характараў герояў у апавяданні «Жалезны камандзір» [5].

В. Быкаў паказвае розныя тыпы вобразаў камандзіраў на вайне. Карпенка, Жаўтых, Полазаў, Клімаў пакутуюць ад неабходнасці аддаваць салдатам загад ісці на смерць, безыменны маёр («Жалезны камандзір») непахісны ў асуджэнні «мяккацеласці» на вайне.

Рускі пісьменнік Б. Васільеў, як і В. Быкаў, перш чым пачаць пісаць пра вайну, сам прайшоў франтавыя «агонь і ваду». Зразумела, што вайна стала адной з галоўных тэм яго прозы. Адметным творам, напісаным у традыцыях «лейтэнанцкай прозы», з'яўляецца аповесць «А зори здесь тихие...», у якой значная роля нададзена вобразу старшыны Фядота Яўграфыча Васкова. Як і героі В. Быкава Карпенка, Жаўтых, Васкоў добра выконвае свае воінскія абавязкі. Ён заўсёды адказны і пунктуальны, паважліва ставіцца да кіраўнікоў: «...Всю свою жизнь Федот Евграфыч выполнял приказания. Выполнял буквально, быстро и с удовольствием, ведь именно в этом пунктуальном исполнении чужой воли видел смысл собственного существования» [7, с. 77–78]. Васкову трыццаць два гады, але адчувае ён сябе больш сталым чалавекам, таму што рана стаў адзіным гаспадаром у сям'і. Б. Васільеў падкрэслівае ў «хмурым старшыне» Фядоце Васкове «мужыцкі розум», «мужыцкую закваску», «цвёрдую нешматслоўнасць», «сялянскую марудлівасць», адметную «мужчынская грунтоўнасць». Такім жа гаспадарлівым, разважлівым чалавекам з'яўляецца і «звычайны калгасны дзядзька» Жаўтых (герой В. Быкава), які праз абставіны вайны быў вымушаны ўзяць у рукі зброю.

Як і герой В. Быкава Жаўтых, Фядот Яўграфыч добрай адукацыі не атрымаў, скончыў толькі чатыры класы. Побач з дзяўчатамі-зенітчыцамі, накіраванымі да яго ў атрад, старшына адчувае сябе неадукаваным чалавекам, хоць пісаць і чытаць ён умее. Васкоў, аднак, добра ведае ўстаў салдата. Усё жыццё старшыны праходзіць менавіта па гэтым дакуменце, які ён свята шануе, па ім вучыць сваіх салдат: «Пример был: двух подружек из второго отделения старшина за рекой поймал. Четыре часа — с обеда до ужина — мораль читал: устав наизусть цитировал, инструкции, наставления...» [7, с. 26].

Старшына Васкоў ставіцца да салдат са строгасцю і патрабавальнасцю, якая, як і ў творах В. Быкава, успрымаецца як неабходная якасць камандзіра на вайне. Разам з тым, Васкоў валодае пачуццём гуманізму. Ён робіць усё магчымае, каб зберагчы дзяўчат ад бессэнсоўнай гібелі. Як і героі В. Быкава Карпенка, Жаўтых, Полазаў, знешне строгі і патрабавальны старшына Васкоў у душы спачувае людзям. Для «сваіх» дзяўчат ён становіцца старэйшым братам, клапоціцца пра іх самаадчуванне, спрыяе вырашэнню канфліктаў і непаразуменняў.

Б. Васільеў ставіць свайго героя ў асабліва складаную сітуацыю: ён павінен камандаваць на вайне атрадам з ліку дзяўчат-зенітчыц. Сустрэўшыся са сваёй групай з шаснаццаццю ўзброенымі фашыстамі, Васкоў «растерянность скрывал. Думал, думал, ворочал тяжелыми мозгами, обсасывал все возможности» [7, с. 83] смяротнай сустрэчы. Са свайго ваеннага вопыту ён ведаў, што ворага без жалю, літасці «бить надо». Разумеючы, як цяжка жанчыне забіваць, тлумачыў дзяўчатам: «Тут одно понять надо: не люди это.., не человеки, не звери даже — фашисты. Вот и гляди соответственно» [7, с. 130]. Дасведчаны, знаходлівы, клапатлівы, Васкоў не здолеў зберагчы ад смерці ні строгую Асяніну, ні гарэзную Жэньку, загінулі ўсе дзяўчаты. Трагедыя «чорным жахам» абпаліла сэрца старшыны, з'явілася «халодная і ашчадная нянавісць» да ворагаў. Прысуд Васкова над забойцамі Соні жудасны: «И не успел фриц тот ни вздохнуть, ни вздрогнуть, как старшина рванул его левой рукой за лоб, задирая голову назад, и полоснул отточенным лезвием по натянутому горлу. Именно так все задумано было: как барана, чтоб крикнуть не мог, чтоб хрипел только, кровью исходя» [7, с. 125].

Б. Васільеў, як і В. Быкаў, паказаў у вобразе камандзіра мужнасць, адвагу, рашучасць, упартасць. Васкоў заўсёды першы ідзе ў бой і прытрымліваецца пазіцыі «ваяваць да канца»: «...Одно знал Васков в этом бою — не отступать. Не отдавать немцу ни кусочка на этом берегу. Как ни трудно, как ни безнадежно — держать. Держать эту позицию, а то сомнут — и все тогда...» [7, с. 173–174].

Як і старшына Васкоў, герой рамана Б. Васільева «В списках не значился» малодшы лейтэнант Мікалай Плужнікаў — адважны чалавек, патрыёт радзімы. Ён ваюе з фашыстамі з самага пачатку вайны. Як і герой В. Быкава Лёшка Клімаў, Плужнікаў зусім малады чалавек, яму толькі дзевятнаццаць гадоў. Ён мог не прымаць удзел у ваенных дзеяннях, але гэтага яму не дазволіла сумленне. Мікалай Плужнікаў ставіцца да вайны сур'ёзна, лічыць, што яго ўдзел у перамозе над фашыстамі неабходны.

У характары галоўнага героя рамана Б. Васільева раскрыта трагічная праўда ваеннага часу. Мікалай Плужнікаў да вайны паспеў скончыць агульнавайсковае вучылішча, стаў прафесійным вайскоўцам, але спачатку ён губляецца ў «пекле», якое ўтварылася ў час штурму Брэсцкай крэпасці. На імгненне Плужнікаў ставіць выратаванне ўласнага жыцця вышэй за ўсё, аднак потым пачынае разумець, што самае страшнае — гэта паніка і разгубленасць. Мікалай вырашае не пакідаць крэпасць, толькі смерць можа апраўдаць яго сыход. Лейтэнант Плужнікаў праходзіць праз страх і адчай, роспач і страту блізкіх, якія сталі амаль роднымі (Дзянішчык, Сцяпан Мацвеевіч, Міра, Сёмішны). У барацьбе з ворагам Мікалай мужнее, набіраецца вопыту. Ён вядзе «сваю» вайну ў крэпасці, не даючы немцам супакоіцца, забыцца, што яны знаходзяцца на чужой зямлі.

Як камандзір Плужнікаў паводзіць сябе крыху разгублена, але спакойна: «Плужников вдруг подумал, что никакой он не командир, что все вопросы за него решает сержант, либо этот смуглый пограничник, но подумал спокойно, потому что обижаться или расстраиваться означало тратить силы, которых не было» [8, с. 104]. Плужнікаў рабіў вылазкі, падрываючы сілы праціўніка, да таго часу, пакуль не застаўся адзін у паўразбуранай крэпасці. Аднак і тады ён вёў няроўны бой супраць фашыстаў. Нарэшце ворагі знайшлі прытулак, дзе ён хаваўся шмат месяцаў.

Твор Б. Васільева ўслаўляе подзвіг і годную гібель савецкага салдата. Нават ворагі прызнаюць яго маральную перавагу: «Русского хотели отнести на носилках. Но он пошел сам… На вопрос немецкого офицера об имени и звании ответил: «Я русский солдат». Повернувшись к генералу, он спросил: «Что, генерал, теперь вы знаете, сколько шагов в русской версте?». Немецкий лейтенант, немного помедлив, вскинул руку к фуражке. Солдаты вытянулись и замерли. Такое мужество и стойкость вызывают уважение даже у врагов [8, с. 36]. Б. Васільеў сцвярджае, што дзякуючы такім мужным абаронцам радзімы, як Плужнікаў, быў пераможаны фашызм.

Фінал рамана Б. Васільева трагічны: з прытулку выводзяць амаль сляпога мужчыну з чорнымі абмарожанымі ступнямі, сівымі валасамі да плячэй. Гэты чалавек не мае ўзросту, цяжка паверыць, што яму толькі дзевятнаццаць гадоў (у канцы твора ўжо дваццаць). Прытулак Плужнікаў пакінуў добраахвотна і толькі пасля весткі пра тое, што Масква не захоплена ворагам.

В. Быкаў і Б. Васільеў стварылі вобраз камандзіра як мужнага героя-ахоўцу. У яго моцны характар, выдатныя арганізатарскія здольнасці, ваенны талент. Камандзір у першую чаргу думае пра сваіх падначаленых.

***Заключэнне.***

В. Быкаў і Б. Васільеў адчулі на сабе ўвесь цяжар вайны, таму ў «лейтэнанцкай прозе» стварылі пераканаўчыя вобразы савецкіх камандзіраў — смелых, рашучых у змаганні з ворагам, сумленных. Яны думаюць перш за ўсё пра людзей. Старшына Карпенка, Жаўтых, Клімаў, Полазаў (героі В. Быкава); Васкоў, Плужнікаў (героі Б. Васільева) — вобразы розныя, але іх звязвае ідэйнае і маральнае адзінства, пачуццё патрыятычнага абавязку, свядомая самаадданасць у змаганні з фашызмам. В. Быкаў шматгранна паказвае вобразы камандзіраў на вайне: Карпенка, Жаўтых, Клімаў, Полазаў

выяўляюць мужнасць, адказнасць, самахвярнасць, непаказны гераізм і, разам з тым, чалавечнасць у адносінах да салдат, безыменны маёр — жаданне выканаць загад любой цаной.

Спіс цытуемых крыніц


1. Быкаў, В. Знак бяды. Абеліск. Жураўліны крык : аповесці / В. Быкаў. — Мінск : Маст. літ., 2019. — 399 с.
2. Быкаў, В. Выбраныя творы / В. Быкаў ; уклад., прадм., камент. М. Тычыны. — Мінск : Беларус. кнігазбор, 2004. — 672 с.
3. Быкаў, В. Поўны збор твораў : у 14 т. / Васіль Быкаў. — Мінск : Кнігазбор, 2019. — Т. 10, кн. 2 : артыкулы, эсэ, прадмовы, выступленні, інтэрв'ю, гутаркі, калектыўныя творы (1981–1990). — Мінск : Беларус. кнігазбор. — 640 с.
4. Быкаў, В. Загад [Электронны рэсурс] / В. Быкаў. — Рэжым доступу : https://knihi.com/Vasil_Bykau/Zahad.html. — Дата доступу : 16.03.2020 г.
5. Шчэрба, Я. В. Вобраз камандзіра ў апавяданнях Васіля Быкава «Загад» і «Жалезны камандзір» / Я. В. Шчэрба // MediaLex-2020 [Электронный ресурс] : электрон. сб. материалов Респ. науч.-практ. интернет-конф. молодых исследователей, Брест, 31 марта 2020 г. / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина ; под общ. ред. Г. М. Концевой. — Брест : БрГУ, 2020. — Режим доступа : http://medialex.brsu.by/MediaLex-2020.pdf.
6. Быкаў, В. Жалезны камандзір [Электронны рэсурс] / В. Быкаў . — Рэжым доступу : https://knihi.com/Vasil_Bykau/Zalezny_kamandzir_insy.html. — Дата доступу : 16.03.2020 г.
7. Васильев, Б. Л. А зори здесь тихие, повесть / Б. Л. Васильев. — М. : Сов. Россия, 1980. — 192 с.
8. Васильев, Б. Л. В списках не значился / Б. Л. Васильев. — Санкт-Петербург : Лениздат, 2014. — 286 с.